baj.by = baj.media

БАЖ – гэта
пра медыя.
Таму наш сайт
цяпер – baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

№4 (74)

жнівень-лістапад
2023 года



# Становішча ў медыясектары Беларусі: жнівень-лістапад 2023 года. Агляд

Працягваліся ціск на журналістаў і абмежаванні свабоды слова ў Беларусі. Яны уключалі у сябе:

- крымінальны пераслед супрацоўнікаў медыяў;
- ужыванне заканадаўства супраць экстрэмізму ў якасці фармальнай падставы для абмежавання свабоды слова;
- прымус блогераў, нават не звязаных з палітычнай павесткай, спыніць публічную дзейнасць;
- цэнзуру ці прымус да самацэнзуры ў пакуль "легальных" незалежных СМІ Беларусі.

Дзейнасць Беларускай асацыяцыі журналістаў па падтрымцы незалежнай беларускай прэсы была адзначана прэміяй Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, уручанай 14 лістапада.

https://baj.media/be/content/muzhnaya-praca-belaruskih-zhurnalistau-bazh-uznagarodzili-premiyay-ushodnyaga-partnyorstva



# Крымінальны пераслед

Узбуджана крымінальная справа за фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці супраць арганізатараў і удзельнікаў дабрачыннага Марафону салідарнасці з беларускімі палітвязнямі "Нам не ўсё адно!", які праводзіўся напрыканцы ліпеня 2023 года пры падтрымцы больш як дваццаці незалежных медыяарганізацый. Міністэрства ўнутраных спраў заявіла, што падазраванымі з'яўляюцца каля 60 чалавек з ліку арганізатараў марафону і іх памочнікаў.

https://baj.by/be/content/na-udzelnikau-translyacyi-marafonu-salidarnasci-z-palitvyaznyami-mus-zavyalo-kryminalnuyu

Былі вынесены тры новыя прысуды па крымінальных справах супраць журналістаў. Былая супрацоўніца тэлеканала "Белсат" Ларыса Шчыракова з Гомеля адрымала тры з паловай гады калоніі, а яе калега з Віцебска Вячаслаў Лазараў – 5,5 года.



https://baj.by/ru/content/gomelskuyu-zhurnalistku-larisu-shchiryakovu-prigovorili-k-35-godam-kolonii

https://baj.by/ru/content/sud-prigovoril-videooperatora-vyacheslava-lazareva-k-55-godam-kolonii-za-sodeystvie

Галоўны рэдактар "Рэгіянальнай газеты" (Маладзечна) Аляксандр Манцэвіч быў пакараны пазбаўленнем волі



тэрмінам на 4 гады і штрафам у памеры 14 800 рублёў (прыблізна 4350 еўра) паводле артыкула 369-1 Крымінальнага кодэкса за нібыта діскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь.

*https://baj.media/be/content/vyneseny-prysud-galounamu-redaktaru-regiyanalnay-gazety-alyaksandru-mancevichu*

У выніку разгляду 21-22 лістапада апеляцыйных скаргаў віцебскага аператара Вячаслава Лазарава і яго жонкі Таццяны Пыцько на прысуд Віцебскага абласнога суда тэрмін зняволення Лазарава быў зменшаны на паўгода – да 5 гадоў, а Пыцько атрымала тое самае пакаранне — тры гады пазбаўлення волі, але з адтэрміноўкай выканання пакарання на тры гады, што дае ёй магчымасць знаходзіцца дома з пэўнымі абмежаваннямі.

*https://vitebskspring.org/news/sud/item/6126-vyarkhouny-sud-zmenshyu-termin-zhurnalistu-frylanseru-vyachaslavu-lazaravu-a-yago-zhonka-tatstsyana-pytsko-budze-vyzvalena-z-adterminoukaj-pakarannya*



З’явілася новая крымінальная справа за супрацоўніцтва з тэлеканалам “Белсат”: у Гомелі быў затрыманы і абвінавачаны паводле артыкула 361-1 Крымінальнага

кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фармавання альбо ўдзел у ім) былы журналіст-фрылансер Андрэй Толчын.

https://baj.media/be/content/byloga-videaaperatara-andreya-tolchyna-vinavacyac-u-ekstremizme

Рэдактар Аршанскага незалежнага сайта orsha.eu Ігар Казмерчак даведаўся, што на яго кватэру ў Беларусі накладзены арышт (найбольш верагодна, што падставай для гэтага стала крымінальная справа за "абразу прэзідэнта", узбуджаная ў адносінах да яго яшчэ ў 2022 годзе).

https://baj.media/be/content/u-belarusi-naklali-arysht-na-mayomasc-redaktara-arshanskaga-nezalezhnaga-sayta

# Пераслед блогераў



Улады скіравалі сваю пільную ўвагу на блогераў, не ўцягнутых напрамую ў палітычную павестку. Так, былі абвінавачаны ў "садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці" (артыкул 361-4 Крымінальнага кодэкса) і змешчаны пад варту спартовы блогер і аўтар Тэлеграм-канала "Сярэбраны век. Футбол Беларусі" Дзмітрый

Сельвяструк і аўтар блога "Пра Столін", былы рэдактар незалежнай раённай газеты Століна Аляксандр Ігнацюк.

https://mediazona.by/news/2023/09/25/selvestruk

https://baj.by/be/content/pravaabaroncy-pryznali-blogera-alyaksandra-ignacyuka-palitvyaznem

Паведамлялася пра затрыманні ўплывовых мінскіх блогераў і медыяперсонаў Ганны Бонд (адбыла 15 сутак адміністрацыйнага арышту за "непадпарадкаванне супрацоўніку міліцыі"), Ларысы Грыбалёвай (знаходзіцца ў так званым "чорным спісе" за асуджэнне гвалту ў 2020 годзе) і Дзяніса Кур'яна, нягледзячы на тое, што яны не закраналі палітычную тэматыку ў сваёй дзейнасці.



https://news.zerkalo.io/life/51579.html

https://baj.media/be/content/pc-vyasna-zyavilasya-infarmacyya-pra-zatrymanne-televyadoucy-i-spyavachki-larysy-grybalyovay

https://tochka.by/articles/life/denis_kuryan_oproverg_informatsiyu_o_svoem_zaderzhanii/

Выглядае, што ўлады імкнуцца, каб у краіне проста не было ўплывовых публічных асобаў, адносна незалежных ад рэжыму. https://nashaniva.com/329849

# Цэнзура і ціск на журналістаў і СМІ

Было зафіксавана 6 затрыманняў на працягу жніўня-лістапада 2023 года, якія ў двух выпадках скончыліся адміністрацыйнымі арыштамі.




Стала відавочнай тэндэнцыя, калі цэнзура выйшла за межы палітычнай тэматыкі і стала распаўсюджвацца на хоць сколькі крытычныя матэрыялы, што тычацца дзейнасці афіцыйных колаў. Першым такім выпадкам стаў разгром телеканала “Ранак”, які ўключаў арышты і штрафы для яго супрацоўнікаў за распаўсюд інфармацыі пра аварыю на прамысловым прадпрымстве.

*https://baj.media/be/content/teleradyyokampaniya-ranak-u-svetlagorsku-faktychna-razgromlenaya*

Міністэрства інфармацыі працягвала ажыццяўляць цэнзуру, блакуючы доступ да кантэнту незалежных СМІ. У прыватнасці, былі заблакаваныя сайты “Plan B”, “Media IQ”, “resport.by”

(новы сайт футбольнай газеты “Прессбол”, створаны пасля таго, як у чэрвені ранейшы сайт быў заблакаваны).

https://baj.by/ru/content/mininform-zablokiroval-sayt-plan-b

https://baj.by/be/content/ministerstva-infarmacyi-belarusi-abmezhavala-dostup-da-saytu-mediaiqinfo

https://baj.by/be/content/prapracavau-adzin-dzen-novy-sayt-presbola-zablakavau-mininfarm

Часова былі заблакаваныя брэсцкі сайт “BrestNote” (з-за гіперспасылкі на “экстрэмісцкае” СМІ ў архіўнай публікацыі), а таксама сайт мазырскай раённай дзяржаўнай газеты “Жыццё Палесся”. Апошняя трапіла пад абмежаванні на час праверкі з-за ананімнай скаргі, што з’явілася ў адным з міліцэйскіх Тэлеграм-каналаў: нехта палічыў падазроным, што рэклама набору ў Ваенную акадэмію размешчана побач з рэкламай пахавальных паслугаў у выпуску газеты ад 19 кастрычніка.

https://baj.by/be/content/ministerstva-infarmacyi-razblakavala-regiyanalny-sayt-brestnote

https://d1j52mw0aso44.cloudfront.net/by/regieny/posle-publikacii-milicejskoj-reklamy-sredi-objavlenij-grobovscikov-iz-seti-propal-sajt-mozyrskoj-rajonki.html

Цікавая з’ява “самацэнзуры” выявілася ў выпадку раённай газеты «Веснік Глыбоччыны», якая па ўласнай ініцыятыве абмежавала доступ да свайго сайта з-за мяжы.

https://baj.by/be/content/rayonnaya-gazeta-vesnik-glybochchyny-abmezhavala-dostup-da-svaygo-sayta-z-za-myazhy




На фоне сістэматычнага пераследу за крытычныя выказванні ў Інтэрнэце, блакавання доступу да дзясяткаў незалежных СМІ і класіфікацыі анлайн-кантэнту пэўных груп як “экстрэмісцкага”, беларускія ўлады арганізавалі ў лістападзе “Форум па кіраванні інтэрнэтам” (“Belarus IGF”), які не праводзіўся з 2020 па 2023 гады, з мэтай стварыць уражанне нармальнасці і легітымізаваць рэпрэсіўныя практыкі. З гэтай нагоды БАЖ разам з іншымі праваабарончымі арганізацыямі выступіла з заявай.

*https://baj.media/be/content/pryznachany-legitymizavac-praktyku-znishchennya-svabody-slova-pravaabaroncy-pra-forum-pa*

# Выкарыстанне “антыэкстрэмісцкага” заканадаўства

## для пераследу за распаўсюд “забароненай” інфармацыі - кантэнту незалежных СМІ і апазіцыйных рэсурсаў

На працягу жніўня-лістапада былі прызнаны “экстрэмісцкімі фарміраваннямі” светлагорскі тэлеканал “Ранак”, “Ex-press.live”, інфармацыйныя інтэрнэт-рэсурсы, звязаныя з праваабарончай арганізацыяй “Гомельская вясна”, а таксама акаўнты ў сацыяльных сетках некалькіх незалежных блогераў.

Вярхоўны суд прызнаў “экстрэмісцкай арганізацыяй” Беларускі расследавальніцкі цэнтр - аб’яднанне журналістаў-расследавальнікаў, што знаходзяцца за межамі Беларусі.

*https://baj.by/be/content/vyarhouny-sud-pryznau-belaruski-rassledavalnicki-centr-ekstremisckay-arganizacyyay*

Асуджаныя супрацоўніцы TUT.BY Людміла Чэкіна і Марына Золатава, журналісты Ларыса Шчыракова, Яўген Меркіс, Павел Падабед, Павел Мажэйка, а таксама Андрэй Фамін былі ўнесены ў спіс грамадзян, “датычных да экстрэмісцкай дзейнасці”.

*https://www.mvd.gov.by/ru/news/8642*

У спіс асоб, “якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці”, Камітэт дзяржаўнай бяспекі ўключыў палітычную аглядальніцу Таццяну Кузіну, асуджаную да 10 гадоў пазбаўлення волі па абвінавачанні ў змове з мэтай захопу дзяржаўнай улады, заклікаў да санкцый і распальванні варожасці.

*http://kgb.by/ru/perechen-inf-ru/*

Шматлікія публікацыі прызнаваліся экстрэмісцкімі матэрыяламі (напрыклад, кантэнт выдання “Ганцавіцкі час”, Інстаграм-акаўнт тэлевядоўцы Кацярыны Пытлевай і інш.).

*http://mininform.gov.by/documents/respublikanskiy-spisok-ekstremistskikh-materialov/*

Суды працягвалі выносіць рашэнні, у якіх «распаўсюджваннем экстрэмісцкіх матэрыялаў» лічылася не толькі публікацыя ці перасылка пэўнага кантэнту, але і падпіска на забароненыя крыніцы інфармацыі. На YouTube-канале, звязаным з сілавікамі, “растлумачылі”, што падпіска на забароненыя рэсурсы фармальна не з’яўляецца правапарушэннем, аднак усё роўна з’яўляецца падставай для пераследу: “Але мы цудоўна разумеем, што калі чалавек такім цікавіцца, значыць, у яго знойдуцца і іншыя парушэнні. Фармальная адсутнасць складу — гэта не нагода ігнараваць парушальніка”.




*https://nashaniva.com/325115*

# Падзеі ў дзяржаўным медыясектары

У 2023 годзе факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту  набіраў абітурыентаў толькі на бюджэтныя месцы. Дэкан факультэта Аляксей Бяляеў заявіў, што ў навучанні на платнай аснове няма неабходнасці: журфак выконвае дзяржзаказ і рыхтуе спецыялістаў для дзяржаўных СМІ.

*https://www.belta.by/society/view/79-zajavlenij-na-60-mest-dekan-zhurfaka-bgu-o-priemnoj-kampanii-na-fakultete-580460-2023/*

Міністр інфармацыі Ўладзімір Пярцоў, праводзячы сустрэчу з першакурснікамі факультэта журналістыкі, назваў іх “баявымі штыкамі ў інфармацыйнай вайне”.

*https://nashaniva.com/325492*

3 жніўня, у сувязі з прыняццем чарговага пакета санкцый Еўрапейскага Саюза ў адносінах да Расіі і Беларусі, былі ўведзены абмежавальныя меры ў дачыненні да некалькіх беларускіх прапагандыстаў: супрацоўнікаў дзяржаўнага тэлебачання Ксеніі Лебедзевай, Яўгена Пуставога, Анастасіі Бенедзісюк, а таксма цяперашняга кіраўніка таварыства «Веды» Вадзіма Гігіна.

*https://baj.by/be/content/es-nalozhil-sankcii-na-belorusskih-propagandistov-v-spiske-gigin-lebedeva-pustovoy-kto-oni*




У кастрычніку ў Малдове за рэтрансляцыю тэлепраграм «Беларусь 24» былі аштрафаваны два тэлеканалы, якія дзейнічаюць у Гагаузскай аўтаноміі. З гэтай нагоды Міністэрства інфармацыі Беларусі выказала абурэнне «жаданнем афіцыйных уладаў Малдовы пазбавіць грамадзян сваёй краіны доступу да любой альтэрнатыўнай інфармацыі».

*https://amp-euroradio-fm.cdn.ampproject.org/c/s/amp.euroradio.fm/u-maldove-ashtrafavali-telekanaly-za-retranslyacyyu-pragram-belarus-24*

«БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з’яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media/